LIETUVOS RESPUBLIKOS ŠVIETIMO IR MOKSLO MINISTERIJA
NACIONALINIS EGZAMINŲ CENTRAS

**2009**

______________________________________________
(savivaldybė, mokykla)

________ klasės mokinio (-ės) ______________________________
(vardas ir pavardė)

# BALTARUSIŲ KALBA (GIMTOJI)

**II egzamino dalis**

## Testas

2009 m. brandos egzaminų pagrindinė sesija

**2009 m. gegužės 18 d.** **Trukmė – 1 val. 30 min.**

**ТЛУМАЧЭННІ:**

- Праверце, ці няма пустых аркушаў ці іншых дэфектаў друку ў вашым тэксце. Калі заўважыце, паведамце настаўніку.
- Пісаць можаце і алоўкам, але канчатковы варыянт павінен быць напісаны ручкай, сінім колерам. Выкарыстоўваць карэктар забаронена.
- Будзе ацэньвацца і культура вашага пісьма: невыразна напісаныя, закрэсленыя адказы не будуць ацэнены (г. зн. за гэты адказ вы атрымаеце 0 балаў).
- На пытанні тэста адказвайце коратка і зразумела. Вашы адказы павінны змясціцца ў адведзеных радках.

**EGZAMINO VERTINIMAS TAŠKAIS**

| I dalis (rašinys arba interpretacija) | | | II dalis (testas) | TAŠKŲ SUMA |
|---|---|---|---|---|
| Turinio vertinimas | Raiškos vertinimas | Raštingumo vertinimas | | |
| | | | | |

Vertinimo komisijos pirmininkas: ______________________
(parašas, vardas ir pavardė)

Vertintojai (I) ______________________
(parašas, vardas ir pavardė)

(II) ______________________
(parašas, vardas ir pavardė)

© Nacionalinis egzaminų centras, 2009

*Прачытайце тэкст і выканайце заданні 1–24*

## АПОКРЫФ

1. Ад Максіма Кніжніка пачатак...
2. І калі скончылася сем тысяч год ад стварэння свету, Хрыстос ізноў зышоў на зямлю і хадзіў па ёй, каб споўнілася тое, аб чым сведчылі пракрокі.
3. І хадзіў Ен па ўсім Забраным Краі і па Занёманшчыне, і па Задзвіншчыне, і па Бярэзінскай зямлі.
4. І разам з ім святы Петра і святы Юр'я. Але ніхто з людзей не пазнаваў Яго.
5. Бо ішлі яны босымі нагамі з непакрытымі галовамі і былі адзетыя ў белы кужаль ды суконныя світкі, а не таго спадзяваліся людзі.
6. Таму ніхто не ўзяў увагі на іх, калі ў часе жніва праходзілі між працуючых людзей.
7. Толькі музыка, катораму цяпер не было чаго рабіць, падыйшоў да іх і сказаў: сорамна мне, бо сягоння дзень працы і ўсе клапоцяцца каля зямлі; адзін я нікчэмны чалавек.
8. І сказаў яму Хрыстос: не смуціся ў сэрцы сваім. Ці ж не твае песні спяваюць яны цяпер, у часе жніва! Таму не схіляй нізка галавы твае, і не хавай аблічча ад вачэй людскіх.
9. Бо няма праўды ў тым, каторы кажа, што ты – лішні на зямлі. Запраўды кажу я табе: надыйдзе яму гадзіна горычы – і чым ён разважыць тугу сваю, апроч песні твае? Як у дзень смутку, таксама ў дзень радасці ён прызавець цябе.
10. І навучаючы яго, казаў: пад песні кладуць чалавека ў калыску, і з спевамі ж апушчаюць у магілу яго.
11. Штодзённымі клопатамі поўніцца жыццё людское. Але калі зварухнецца душа чалавека, – толькі песня здолее спатоліць яе. Шануйце ж песні свае.
12. Бо спяваюць навет і жабы ў багне, а ці ж не лепшымі будзеце вы за іх?
13. Так навучаў Хрыстос музыку. Але Петра, пачуўшы словы яго, сказаў: Вучыцелю, у гэтай краіне ёсць людзі, каторым няма чаго есці. Ці ж не сціснецца ад сораму сэрца таго чалавека, каторы, шукаючы скарынкі хлеба, прыйдзе з песняй да іх?
14. У адпаведнасці яму, сказаў Хрыстос: так, жыццё гэтых людзей цяжкое, беднае і прыгнечанае. Чаму ж ты хочаш яшчэ пазбавіць іх красы! Мала дадзена ім – няўжо ж трэба, каб было яшчэ менш?
15. І, абярнуўшы аблічча свае да музыкі, папытаўся: калі пяюць песні ў вас?
16. Музыка адказаў: пяюць на Каляды, на Запускі, на Вялікдзень, на Тройцу, на Яна Купалу, у Пятроўку, на зажынках і дажынках.
17. Пяюць на радзінах і хрэсьбінах, пяюць дзіцё калыхаючы, і самі дзеці пяюць гуляючы; пяюць на ігрышчах і вяселлях, і на хаўтурах, і ў бяседзе, і пры працы, і на вайну ідучы, і ва ўсякай іншай прыгодзе. Увесь круглы год пяюць.
18. І мовіў Хрыстос Пятру: ты, шкадуючы галодных людзей, асудзіў песню, але самі галодныя не асудзілі яе. Жывая яшчэ душа ў народзе гэтым.
19. Тады ізноў сказаў Петра: але няхай жа ў песнях будзе страва для душы, няхай будуць думкі добрыя і навучаючыя, каб апроч красы, быў у іх і спажытак чалавеку.
20. І адказаў яму Хрыстос: няма красы без спажытку, бо сама краса і ёсць той спажытак для душы.
21. І навучаючы іх, мовіў: агляніцеся навокал! Ці ж не ніва калыхаецца каля нас?
22. Цяжка каля яе працаваў гаспадар і вось бачыць: паміж збожжа ўзраслі васількі.
23. І сказаў ён у сэрцы сваім: хлеб адбіраюць у мяне гэтыя сінія кветкі, бо поўнаважкія каласы маглі б узрасці тут заміж васількоў.
24. Але яшчэ з малацця краса іх прыйшлася мне да душы. І таму я не вырву з каранём іх і не выпляню, як усякае благое зелле. Няхай растуць і радуюць, як у маленстве, сэрца мае.
25. Так казаў сабе гаспадар у сэрцы сваім! І не падняў ён рукі на васількі.
26. Я ж кажу вам: добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?

27. І, кажучы так, пачуў ён песню жнеек, і прамовіў: слухайце што кажуць словы гэтай песні. Яе складалі людзі, якія ведаюць, чаго варты хлеб.
28. Яны ж пачулі, што словы тэй песні кажуць: няма лепш цвяточка над васілёчка. І далей ужо моўчкі ішлі яны.
29. І босыя ногі Хрыста пакідалі на цёплым, мяккім пылу дарогі сляды.
30. Але гора вам, людзі, бо даўно ўжо затапталі вы іх.
Амін.

*Рукапіс гэты адшукаў Максім Багдановіч (1913)*

## *Заданні да тэксту (40 балаў)*

| | Балы | |
|---|---|---|
| I | II | III |

1. Сфармулюйце галоўную думку апавядання.

___

___

___

(2 балы) | ___ | ___ | ___ |

2. Выпішыце 2 сказы, у якіх сцвярджаецца, што песня суправаджае чалавека на працягу ўсяго жыцця.

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

(2 балы) | ___ | ___ | ___ |

| | Балы | |
|---|---|---|
| I | II | III |

3. Як вы разумееце словы св. Пётры: ***Але няхай жа ў песнях будзе страва для душы, няхай будуць думкі добрыя і навучаючыя, каб апроч красы, быў у іх і спажытак чалавеку***?

(2 балы) ___ ___ ___

4. Пра якую краіну гаворыцца ў 3-м сказе?

(0,5 бала) ___ ___ ___

5. Чаму аўтар называе гэты край ***Забраным***?

(1,5 бала) ___ ___ ___

6. Чаму музыку было сорамна ў гэты дзень? *Адкажыце словамі тэкста.*

(1 бал) ___ ___ ___

7. Як вы разумееце сэнс наступных слоў: ***добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком***?

(2 балы) ___ ___ ___

8. Чаму, на думку аўтара, трэба шанаваць песні свае?

(2 балы) ___ ___ ___

| | Балы I | II | III |
|---|---|---|---|

9. Да аднародных членаў сказа ***Музыка адказаў: пяюць на Каляды, наЗапускі, на Вялікдзень, на Тройцу, на Яна Купалу, у Пятроўку, на зажынках і дажынках*** падбярыце абагульняючае слова.

___

(1 бал) ___ ___ ___

10. Якія словы М. Багдановіча з гэтага твора сталі афарызмам?

___

(1 бал) ___ ___ ___

11. Тлумачальны слоўнік дае такое азначэнне слова *Апокрыф:*
***Апокрыфы*** *(ад грэч. apokryphos - патаемны, запаветны) - мастацкія аповесці ў сярэднявечнай літаратуры, сюжэтна звязаныя з Бібліяй, жыціямі святых, легендамі пра рай, пекла, канец свету. Забараняліся царквой як некананічныя.*

Чаму М. Багдановіч так назваў свой твор?

___

___

___

(2 балы) ___ ___ ___

12. Выпішыце слова, якое ў хрысціянскай традыцыі стала ўстойлівай канцоўкай многіх кананічных твораў.

___

(0,5 бала) ___ ___ ___

13. У аснове хрысціянскага веравучэння ляжыць уяўленне, што сапраўднасць і значнасць мае толькі тое, што створана:
**А** – прыродай;
**Б** – Богам;
**В** – чалавекам.

*Правільны адказ абвядзіце.*

(1 бал) ___ ___ ___

14. Чаму М. Багдановіч заканчвае твор сказам ***Рукапіс гэты адшукаў Максім Багдановіч***?

___

___

(2 балы) ___ ___ ___

15. У 1913 г. у газеце „Наша ніва” быў змешчаны артыкул В. Ластоўскага, у якім аўтар пісаў:***...Маё штодзённае жыццё шэрае, цяжкое, і я хачу з вашых твораў навучыцца бачыць каля сябе красу, каторую я чую, што ёсць, але мая душа не так чутка, каб улавіць яе***. Што агульнага ў тэкстах М. Багдановіча і В. Ластоўскага?

___

___

___

(2 балы) ___ ___ ___

Балы I II III

16.1. У тым жа 1913 г. выйшаў адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў М. Багдановіча. Як ён называўся?

______________________________________

(1 бал)

16.2. У якім горадзе быў надрукаваны гэты зборнік?

______________________________________

(1 бал)

17. Знайдзіце ў тэксце чатыры словы ці граматычныя формы слоў, якія ў сучаснай беларускай літаратурнай мове лічацца ўстарэлымі.

______________________________________

______________________________________

(1 бал)

18. Якія з пералічаных лінгвістычных асаблівасцей уласцівы тэксту? У табліцы насупраць нумара, які называе лінгвістычную асаблівасць, абазначце выбраны адказ ТАК ці Не знакам +. Пад нумарам 0 даецца ўзор.

0. Простая мова;
1. Ужыванне дзеясловаў у форме загаднага ладу;
2. Ускладненне сказа аднароднымі членамі;
3. Гіпербала;
4. Устарэлыя словы;
5. Памяншальна-ласкальныя формы назоўнікаў.

| № | Так | Не |
|---|---|---|
| 0. | + | |
| 1. | | |
| 2. | | |
| 3. | | |
| 4. | | |
| 5. | | |

(2,5 бала)

19.1. Вызначце, да якога стылю адносіцца тэкст.

______________________________________

(0,5 бала)

19.2. Прывядзіце 3 аргументы і праілюструйце кожны з іх адным прыкладам.

______________________________________

______________________________________

______________________________________

______________________________________

______________________________________

______________________________________

(3 балы)

20. Выпішыце з тэксту два прыклады дзеепрыслоўных зваротаў і вызначце іх сінтаксічную функцыю ў сказе.

______________________________________

______________________________________

______________________________________

(2 балы)

| | Балы | |
|---|---|---|
| I | II | III |

21. У сказе ***I не падняў ён рукі на васількі*** знайдзіце фразеалагізм і растлумачце яго значэнне.

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

(0,5 бала)

22. З тэксту выпішыце пяць слоў, у якіх назіраецца фанетычная з'ява аканне, – пераход *о, э* ў *а* ў ненаціскной пазіцыі. У якасці ілюстрацыі да выпісаных слоў падбярыце аднакарэнныя словы.

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

(2,5 бала)

23. У тэксце знайдзіце і выпішыце два сказы (ці частку складанага сказа) з адваротным парадкам слоў.

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

(2 балы)

24. Знайдзіце памылкі і запішыце словазлучэнні ў адпаведнасці з нормамі беларускай літаратурнай мовы.

Смяяцца пра сябе – _________________________________________________

Дом у пяць паверхаў – _____________________________________________

Некалькі разоў у тыдзень – _________________________________________

Падобны на бацьку – ______________________________________________

Загадчык бібліятэкай – ____________________________________________

Пісаць па адрасу – ________________________________________________

(1,5 бала)